Viestki539.qxd 1/22/2011 2:58 AM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

№ 1 (539)
Студзень 2011 г.



Belarusan American Association, Inc.
P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572



Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org


## Шчасьлівага Новага 2011 году і радасных Калядаў!

# У падтрымку свабодных выбараў у Беларусі




У нядзелю, 19-га сьнежня, на 3-й Авэню на Мангэтане прайшоў мітынг за свабодныя і празрыстыя выбараў у Беларусі. Ён быў зладжаны Нью-Ёрскім аддзелам БАЗА і прыцягнуў шмат удзельнікаў. Напачатку мітынгу старшыня Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА Віталь Зайка распавёў прысутным пра мэты акцыі. “Сёньня ў Беларусі адбыліся выбары. На гэты час яны ўжо канчаюцца. Аднак ніякіх гарантыяў свабоды і празрыстасьці выбараў не было. Адпачатку дзейны прэзыдэнт меў да паслугаў увесь магутны дзяржапарат і кішэнны выбарчы камітэт. Нязьмененым засталося выбарчае заканадаўства, правы назіральнікаў засталіся абмежаваныя, ціск і ўмяшаньне рэжыму ў волевыяўленьне грамадзянаў ня зьменшыліся. Таму мы сёньня выйшлі сюды, да кансуляту Рэспублікі Беларусь, каб заявіць аб сваёй салідарнасьці з дэмакратычнымі сіламі Беларусі, што зараз выходзяць на вуліцы, каб патрабаваць сыходу Лукашэнкі й правядзеньня сапраўды свабодных выбараў.” Гучэлі лёзунгі “Далоў Лукашэнку”, “Беларусь – так, Лукашэнка – не”, “Жыве Беларусь!”. Лунялі бел-чырвона-белыя сьцягі. Удзельнікі акцыі трымалі плякаты ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі і супраць яшчэ аднаго тэрміну для Лукашэнкі.

Мінакам раздаваліся ўлёткі пра мэты акцыі.

***Віталь ЗАЙКА***

Viestki539.qxd 1/22/2011 2:58 AM Page 3 (1,1)



# Сьнежаньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 11 сьнежня, у Доме Марака на Мангэтане прайшоў чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка, паведаміў пра апошнія падзеі ў Беларусі і ўзгадаў пра маючыя адбыцца 19 сьнежня выбары на прэзыдэнцкую пасаду ў Беларусі. Прамоўца адзначыў, што ў сьвятле інфармацыяў аб парушэньнях у ходзе передвыбарчага працэсу кіраўніцтва аддзелу БАЗА рыхтуе мітынг у Нью-Ёрку, прысьвечаны патрабаваньню празрыстых і дэмакратычных выбараў, а таксама салідарнасьці з дэмакратычнымі сіламі ў Беларусі. Прапанова была падтрыманая прысутнымі, і мітынг было пастаноўлена правесьці на 3-й Авэню ў Мангэтане, каля кансуляту Рэспублікі Беларусь у Нью-Ёрку.

Затым архіяпіскап БАПНЦ Юры (Рыжы) прапанаваў ушанаваць хвілінаю цішы памяць Слуцкіх герояў, а таксама памяць Максіма Багдановіча.

Да 119-х угодкаў дня народзінаў Максіма Багдановіча Віталь Зайка і Валянціна Якімовіч засьпявалі славутую песьню-раманс на словы М. Багдановіча “Зорка Вэнэра”, а сп. Віктар Едзіновіч прачытаў верш М. Багдановіча “Сярод пяскоў Эгіпскае зямлі, над хвалямі сінеючага Нілу”.

Затым з кароткай інфармацыяй пра передвыбарчую кампанію ў Беларусі выступіў сябар Сойму Партыі БНФ Сяргей Антусевіч.

Пасьля сходу прайшло паседжаньне ўправы Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА.

**Віталь ЗАЙКА**

# Мітынг пратэсту і салідарнасьці

У пятніцу, 24 сьнежня, каля кансуляту Рэспублікі Беларусь на Мангэтане адбыўся мітынг пратэсту супраць рэпрэсіяў у Беларусі і адначасна салідарнасьці зь беларускімі дэмакратычнымі сіламі. Ён быў арганізаваны Нью-Ёрскім аддзелам БАЗА. У пачатку ў сваёй прамове старшыня аддзелу Віталь Зайка сказаў, што мэтаю мітынгу ёсьць пратэст супраць перасьледу дэмакратычных беларускіх сілаў і салідарнасьць зь імі. Прамоўца адзначыў, што ў выніку дэманстрацыіў Менску 19 сьнежня і брутальнага яе падаўленьня рэжымам Лукашэнкі было арыштавана больш як 600 чалавек, у тым ліку 5 былых прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду – зьява хіба без прэцэдэнту ў сьвеце. Па ўсёй Беларусі ідзе збор дапамогі арыштаваным, і па сьвеце праходзяць акцыі пратэсту супраць тэрору, які абрынуў рэжым Лукашэнкі на дэмакратычныя сілы.

Затым слова ўзяў прадстаўнік старэйшага пакаленьня беларусаў у Амэрыцы др. Вітаўт Кіпель. Ён адзначыў неабходнасьць праяўленьня салідарнасьці з змагарамі ў Беларусі і распавёў пра стварэньне адмысловага камітэту, задачаю якога будзе разгляд дзеяньняў рэжыму і магчымыя наступствы для яго. Сп. Юры Зянкевіч распавёў пра стварэньне фонду па зборы сродкаў у дапамогу арыштаваным у Менску і іхным сем’ям.

З рэзкім асуджэньнем дзеяньняў лукашэнкаўскіх памагатых па разгоне дэманстрацыі ў Менску і жорсткага зьбіцьця кандыдата Уладзімера Някляева выступіў у сваёй прамове старшыня Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. Ён выказаў занепакоенасьць лёсам паэта Някляева і нагадаў, што няпэўная сытуацыя зь ім падобная на тое, як, па-мэдыцынску, быў зьнішчаны ў шпіталі Васіль Быкаў. Сп. Зянон Пазьняк распавёў пра ход падзеяў апошняга тыдня ў Менску, адзначыўшы супрацьпраўныя дзеяньні рэжыму, якія пайшоў на экстрымальныя і брутальныя меры для здушэньня волевыяўленьня народу. Прамоўца казаў пра хлусьню, што ліецца з афіцыйных сродкаў інфармацыі ў Беларусі.

Падчас акцыі гучэлі лёзунгі: “Беларусь – так! Лукашэнка – не!”, “Далоў Лукашэнку!”, “Свабоду палітвязьням!”, “Жыве Беларусь!”

Удзельнікі трымалі плякаты з патрабаваньнямі спыніць тэрор у Беларусі і вызваліць ўсіх палітычных зьняволеных. Мінакам раздаваліся ўлёткі з інфармацыяй пра падзеі ў Беларусі.

**Віталь ЗАЙКА**






Viestki539.qxd 1/22/2011 2:59 AM Page 3 (3,1)



# Лістападаўскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 20 лістапада, адбыўся чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку старшыня аддзелу Віталь Зайка коратка распавёў пра 90-я ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну, адзначыў важнасьць першага ў найноўшай гісторыі выступу беларусаў са зброяй у руках супраць ворагаў свайго народу, які дасюль ігнаруецца і перакручваецца ўладамі ў Беларусі. Прамоўца заклікаў прысутных узяць удзел у рыхтуемай сумесна з аддзелам БАЗА ў Нью-Джэрзі імпрэзе ў гонар Случчакоў 28 лістапада ў Гайлэнд-Парку. Прысутныя ўшанавалі памяць Случчакоў хвілінаю цішы.

Затым перад прысутнымі выступіў госьць аддзелу, сябра Сойму Партыі БНФ Сяргей Антусевіч. Сп. Антусевіч з Горадні, абраны на Сойм Партыі БНФ у 2003 годзе, і з 2003 па 2007 год абіраўся дэпутатам у горадзенскаю гарадзкую раду. Зь верасьня ён знаходзіцца на стажы па праграме правоў чалавека ў Калюмбійскім унівэрсытэце ў Нью-Ёрку.

Сп. С. Антусевіч ахарактэрызаваў бягучы палітычны момант у Беларусі, накрэсьліў разьмеркаваньне сілаў у палітычным жыцьці Беларусі і працэс падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў, што прызначаныя на сьнежань месяц. У прыватнасьці выступоўца адзначыў, што пасьля выбараў 2006 г. апазыцыя не высунула свайго адзінага кандыдата на выбары, а фактычнай адбыўся развод сілаў па партыйнай афіліяцыі. А. Мілінкевіч, нажаль, адмовіўся ад кандыдацтва ў прэзыдэнты. Да выбараў партыі й рухі прыйшлі “асобнымі калёнамі”, і таму сёлета такая вялікая колькасьць кандыдатаў. Гэта напэўна кепска, але, прынамсі, дазваляе новым кандыдатурам выпрабаваць свае мажлівасьці. “Хаця асабіста ў мяне выклікае сумніў, што ўсе 10 кандыдатаў сабралі па 100 тысяч подпісаў на кандыдацтва. Скажам, у 2005 годзе Яраслаў Раманчук падчас парлямэнцкіх выбараў не сабраў і 1000 галасоў падтрымкі, а тут раптам ён кандыдатуе ў прэзыдэнты. Напэўна, Лукашэнку выгадная большая колькасьць кандыдатаў, фрагмэнтызацыя апазыцыйнай электаральнай падтрымкі – таму на пэўныя рэчы ён загадаў заплюшчваць вочы. Рэжым імітуе адкрытасьць, спрабуе пераканаць перш за ўсё Захад, што ёсьць дэмакратыя, што працэс празрысты. Асноўная мэта ўсяго – дабіцца прызнаньня збоку Захаду, нічога не мяняючы. А Захад пасылае сыгналы, што будзе вітаць нават самыя мінімальныя зьмены.” Сп. Антусевіч адзначыў што днямі быў на сустрэчы ў Калюмбіі з прэзыдэнткаю Летувы Даляй Грыбаўскайтэ, і тая фактычна прызнала, што Эўразьвяз у разгубленасьц, за 16 год не далі рады Лукашэнку, цяпер спрабуюць пернікі супрацоўніцтва і ў пэрсьпектыве і сяброўства ў Эўразьвязе. Лукашэнка цалкам кантралюе дзяржмэдыі, паліцэйскія і вайсковыя структуры, адсочвае літаральна ўсё, што адбываецца ў краіне. І тыя некалькі хвілін этэрнага часу для альтэрнатыўных Лукашэнку кандыдатаў наўрад што зьменяць у сэнсе інфармаваньня насельніцтва. Штмат хто заве перадвыбарчы працэс цыркам, кляўнадай і г. д . Аднак па выніку ўсё-ж магчыма стварэньне нейкага нацыянальнага праваЦэнтрысцкага блёку, і варта было-б рэальна гэтым заняцца. Эканамічны крызіс Беларусь фактычна не закрануў, дзеля невялікай ангажаванасьці яе ў сусьветную эканоміку, завязанасьць на Расею і адсутнасьць фондавага рынку. Але цяпер цяжка памяняць беларускія грошы на даляры. “Наагул хачу адзначыць, што Беларусь мае ўсе належныя ўмовы і рэсурсы, у тым ліку чалавечыя, інтэлектуальныя, каб хутка рухацца наперад і значна падвысіць узровень жыцьця. Сёньня краіна топчацца на месцы, і шкада, што сыходзіць час, сыходзіць жыцьцё. Разам з тым, кожны год незалежнай Беларусі – гэта год кшталтаваньня народу, набліжэньне да сапраўднай свабоды і дэмакратыі.”



Сяргей Антусевіч.

Сп. Сяргей Антусевіч адказаў на пытаньні прысутных, што закранлі такія тэмы, як лёс беларускай мовы, інфармацыя па асобных кандыдатах у прэзыдэнты, рэйтынг Лукашэнкі, вартасьць байкату выбараў, праблемы адносінаў з Расеяй, каго падтрымлівае моладзь ды інш.

Затым былы старшыня Галоўнай управы БАЗА Антон Шукелойць у сувязі з надыходзячымі 90-мі ўгодкамі Слуцкага Збройнага Чыну выступіў з інфармацыяй пра сьвяткаваньне Слуцкіх угодкаў у Вільні й Заходняй Беларусі ў міжваенны час і падзяліўся ўспамнамі пра тых ўдзельнікаў Збройнага Чыну, якіх ён асабіста ведаў: М. Бусла, М. Косьцевіча (Краўцова), М. Шылу, а. Х. Данілюка, А. Сокал-Кутылоўскага.

Сп. Марат Клакоцкі выступіў з кароткім словам пра свой больш як васьмігадовы пэрыяд працы ў якасьці рэдактара газэты “Беларус” і прадставіў апошні (лістападаўскі) нумар газэты, які выйшаў пад ягонай рэдакцыяй. Ад студзеня 2011 году інфармацыйным ворганам аддзелу зноў стане бюлетэнь “Весткі й Паведамленьні Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА”, які падчас рэдактарства сп. Клакоцкага ў “Беларусе” быў часткаю газэты, але неўзабаве стане выходзіць асобным выданьнем.

У традыцыйным разьдзеле “Рознае” адбылося знаёмства з гасьцямі аддзелу, прагучалі аб'явы й паведамленьні.

**Віталь ЗАЙКА**

Viestki539.qxd 1/22/2011 3:14 AM Page 1 (1,1)



# Сумеснае сьвяткаваньне

Аддзелы БАЗА ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі сумесна правялі сьвяткаваньне 90-х угодкаў слаўнай падзеі ў гісторыі Беларусі – Слуцкага Збройнага Чыну 1920 году, які назаўсёды застанецца ў беларускай гісторыі прыкладам ахвярнасьці й адвагі слаўных сыноў беларускага народу.

На Дзень Герояў, 27 лістапада, на беларускіх могілках у Іст-Брансўіку ўсклалі вянкі да помніка змагарам за вольную Беларусь. Пры гэтым з кароткаю прамоваю выступіў дырэктар БІНіМ др. Вітаўт Кіпель, прагучаў жалобны сьпеў “Сьпі пад курганам герояў”.

У нядзелю, 28 лістапада, пасьля набажэнства ў царкве сьв. Маці Божае Жыровіцкае ў Гайлэнд-Парку была адслужаная паніхіда па Слуцкіх змагарах – удзельніках Слуцкага Збройнага Чыну. Затым адбылася ўрачыстая акадэмія памяці герояў-случчакоў.

Напачатку з прывітаньнямі да прысутных выступілі старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрка Азарка і старшыня аддзелу ў Нью-Ёрку Віталь Зайка. Быў таксама прачытаны ліст ад старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла. Сп. Азарка паказаў прысутным сьцяг Задзіночаньня Беларускіх Вайскоўцаў на чужыне, выраблены ў 1948 г. у Віндышбэргергсдорфе (Нямеччына), пад якім звычайна праводзіліся сьвяткаваньні Дня Герояў.

Др. Вітаўт Кіпель выступіў з паведамленьнем аб гісторыі сьвяткаваньня Дня Герояў на эміграцыі і аб слушнасьці канцэпту “збройны чын” у параўнаньні да “паўстаньня” пры характэрызацыі падзеяў на Случчыне ў 1920 г.

Пра Слуцкі Збройны Чын у мастацкай творчасьці згадаў у сваёй прамове мастак і скульптар Алесь Шатэрнік.



*Сп. Юрка Азарка дэманструе сьцяг.*

Са зьместоўным рэфэратам пра Слуцкі Збройны Чын выступіў сябар Беларускага Маладзёвага Руху Дзяніс Таўпека. Ён накрэсьліў агульны гістарычны фон Слуцкіх падзеяў, распавёў пра скліканьне Рады Случчыны, пра хаду вайсковых дзеяньняў супраць пераўзыходзячых бальшавіцкіх сілаў. Прамоўца прыводзіў у сваім рэфэраце цытаты з успамінаў удзельнікаў Слуцкага Збройнага Чыну. Удзельнікі імпрэзы прагледзелі дакумэнтальны фільм, прысьвечаны гістарычнай падзеі.

Другою часткаю імпрэзы стала праграма, прысьвечаная 100-годзьдзю выдатнай паэткі Ларысы Геніюш. Праграма была падрыхтаваная сп. Сяржуком Сокалавым-Воюшам, а таксама Славамірам і Сьвятавітам Сокалавымі, і сп-няй Валяй Якімовіч. З успамінамі пра пясьнярку трагічнага часу беларускай гісторыі выступілі сп-ня Валянціна Трыгубовіч і сп. С. Сокалаў-Воюш. Абодва прамоўцы ведалі Ларысу Геніюш асабіста, сустракаліся зь ёю. Ларыса Геніюш не прыняла савецкага грамадзянства, фактычна была беларускай дысыдэнткаю і пражыла да сьмерці ў Зэльве, дзе і пахаваная. Нажаль, постаць Л. Геніюш да сёньня ў Беларусі “нязручная”, яе памяць замоўчваецца, імпрэзы ў яе гонар заўсёды спатыкаюць перашкоды збоку ўладаў. Сп. Алесь Шатэрнік распавёў аб працы над шыльдаю, што была ўсталяваная на доме, дзе жыла паэтка.

Для прысутных прагучалі вершы Ларысы Геніюш у чытаньні сп-ні В. Якімовіч і сп. В. Зайкі. У праграме прагучалі таксама голас самой паэткі і песьні на яе словы.

Падзяка за арганізацыю імпрэзы належыць сябрам аддзелаў БАЗА ў Нью-Джэрзі й Нью-Ёрку, а таксама Беларускаму Маладзёваму Руху, парафіянам і радзе царквы сьв. Маці Божае Жыровіцкае.

**Віталь ЗАЙКА**

**Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА**
Складкі і ахвяраваньні:

**Н. Аўраменка** .................50
**А. Базевіч** .....................50
**К. Булаўко** ....................50
**Ю. Вішнеўская** ...............50
**Г. Гвазьдзеўская** .............50
**Ц. Кажан** ......................50
**Ю. Кажан** ......................50
**А. Кучарук** ....................50
**К. Ліпская** .....................50
**Г. Саўчук** .......................50
**А. Сахончык** ..................50
**М. Ульянава** ..................50
**В. Чаранкова** .................50

**Усім шчыры дзякуй!**

**Уплаты ў аддзел шліце на адрас:**
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу**, **15 студзеня 2011 г.** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі* ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да станцыі* ***Union Square****. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Юніян-скўэр па 15-й вуліцы, на скрыжаваньні з Ірвінг-плэйс.*

Заля месьціцца на **2-м** паверсе.

Пачатак сходу: **а 6:00** вечара.

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку* ***www.baza-belarus.org***

**Ахвяравалі на выданьне бюлетэня** *Весткі й Паведамленьні* :

**Н. Аўраменка** ..................30
**А. Базэвіч** .......................30
**Т. Бойка** .........................30
**К. Булаўко** .......................30
**Ю. Вішнеўская** ..................30
**Г. Гвазьдзеўская** ...............30
**Ц. Кажан** ..........................30
**Ю. Кажан** ..........................30
**А. Кучарук** ........................30
**З. Левіт** ............................30
**К. Ліпская** .........................30
**Г. Саўчук** ..........................30
**А. Сахончык** ......................30
**М. Ульянава** ......................30
**В. Чаранкова** .....................30

**Шчыры дзякуй!**

*Рэдакцыю бюлетэня бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя чытачамі і сябрамі водгукі й лісты.*

*Дописы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***